**УДК 39**

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ МАГІЧНЫЯ ПРАКТЫКІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ: САЦЫЯЛЬНЫ КАНТЭКСТ І ПРАГМАТЫКА

***І. Г. БОНДАР***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Чараўніцтва закранала ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, то бок яго фізічнае і псіхічнае здароўе, сямейныя і грамадскія адносіны, гаспадарчы і прафесійныя заняткі. Разгледжаны традыцыйныя магічныя практыкі на тэрыторыі Падзвіння, выяўлен іх сацыяльны кантэкст.*

***Ключавыя словы:*** *чараўніцтва, чараўнікі, падлогі, сурокі.*

Сярод вясковага насельніцтва Беларусі, незалежна ад рэгіёну, існуе уяўленне пра людзей, якія валодаюць звышнатуральнымі здольнасцямі і могуць уплываць на знешні свет як у пазітыўным, так і ў негатыўным ключы. Уяўленні пра асоб, што могуць аказваць шкаданосны ўплыў на навакольны свет, застаюцца даволі трывалымі і ў сучаснай культуры беларускай вёскі. На тэрыторыі Падзвіння такія людзі найчасцей маюць назву *чараўнік* і *чараўніца*, радзей – *вядзьмак* (*ведзьма*), альбо *калдун* (*калдунья*). Разам з тым, вобраз чараўніка (чараўніцы) ў традыцыйнай карціне свету далёка не стэрэатыпны і мае шмат нюансаў. Вобраз і сімвалічны статус чараўнікоў у традыцыйнай карціне свету мае свае лакальныя асаблівасці, на якія мае уплыў: канфесійная структура нсельніцтва, узровень мадэрнізацыі, асаблівасці этнакультурнай гісторыі рэгіёна, этнас.

Чараўніцтва ўяўляе сабой прыватны выпадак магіі, у аснове якога закладзены большасці недаступныя веды і дзеянні.Сілы, на думку мясцовых жыхароў, чараўнікі атрымліваюць ад чорта або кніг:*"Той, хто падрабляе – гэта чорта чалавек. Ну, ён заданьні чорта выпалняець – чалавек зла. Гэты чалавек – чарнакніжнік, яны ж чытаюць кнігі. А пра іх я слыхаў так, што яны вучацца на гэтага чарнакніжніка, ён чытаець кнігу, ну ў то врэмя, када чэрці ходзяць – з адзіннацаці да часу ночы."(Ушацкі р-н)*[4, с. 38].

Здароўе і гаспадарка – самае галоўнае ў жыцці вясковага насельніцтва, а значыць большасць магічных дзеянняў у сярэдзіне ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя накіравана на іх, але ў ХХІ стагоддзі сфера гаспадарчай актыўнасці сучасных вяскоўцаў значна звузілася, адна з прычын – рэзкае скарачэнне пагалоўя буйной хатняй жывёлы, таму магічныя практыкі пераважна скіроўваюцца на здароўе людзей і іх асабісты лёс.

У рэальнасці чараўніцтва мела тры формы ўвасаблення ў жыццё. *Першая* форма – вербальная, то бок магічная сіла надавалася замовам і праклёнам. *Другая* – акцыянальная, калі жаданая мэта дасягалася з дапамогай дзеянняў сімвалічнага характару. *Трэцяя* – атрыбутыўная, або прадметна-рэчавая, калі пэўны аб'ект надзелены магічнымі асаблівасцямі, найчасцей гэта можна сустрэць у звестках пра "падлогі".

У другой палове ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя актуальным сюжэтам у звестках пра чарадзейства з'яўляюцца шкаданосныя *падлогі* – наўмыснае і таемнае размяшчэнне ў жыццёвай прасторы чалавека (сям'і) рэчаў ці прадметаў з выразнай сімволікай смерці ці хваробы. Актуалізацыя чараў супраць асабістай долі чалавека (здароўя, сямейнага ладу) ці яго гаспадаркі абумоўлена тым, што пагалоўе хатняй жывёлы, як аб'ект магічнага уздзеяння, радыкальным чынам зменшылася. *"І аднажды я ўвідзела сваю саседку, выбігаюшчай [...] Всё там падкладавалі [...] всякія вузлы накручана [...] Ані ж тагда не должны з кем-та разговарівацaverage [...]І клубніка была красная і крупная, вся высохла до едзінава! [...] І я нашла там пакет такой, чэво-та там накручана" (Верхнядзвінскі р-н)*[1]*; "Адна баба адбіла ў другой мужыка. [...] І тут пачала гэта другая сохці, бо першая падкінула ёй яйка пад хату. Другая жонка спужалася і кінула тое яйка ў раку. Яна сразу жа палепшыла, але мужык той памёр" (Ушацкі р-н)*[4, с. 17].

Звяртае на сябе ўвагу сацыяльны кантэкст шкаданосных магічных практык у рамках вясковай супольнасці. У большасці выпадкаў чараўнікі шкодзілі сваім суседзям і прычынамі, як правіла, былі побытавыя канфлікты і няпростыя асабістыя ўзаемаадносіны такія як зайздрасць, маёмасныя прэтэнзіі, невяртанне ў час пазыкі, сацыяльная няроўнасць ці персанальныя крыўды, асабістая антыпатыя, антаганізм характараў і інш. Існуе два сюжэта вырашэння канфліктаў: дэманстрацыя звышнатуральных здольнасцяў і учыненне шкоды ў любой сферы жыццядзейнасці ахвяры. *"Дзяўчына, і яна гэта нешта вот ей панравіўся мой [...] ў іхнім сяле была бабка, што ўмела зрабіць. І мы пайшлі на работу, і вот ішлі*

[1]Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ): зап. Бондар І. у 2019 г. ад Рудлевскай Ганны Станіславаўны, 1943 г. н. у г. Верхнядзвінск.

*з работы, жарка было і бабы сабралісь усе да гэтай бабы да хаты папіць вады, яны п'юць ваду, а яна круценька квас мне з хаты вынесла, там ужо мусіць быў зроблена [...] я выпіла гэтага кваску і там недалёка адтышлася, яшчэ і бабы гэтыя ідуць, а мене ташніць начало[...] і я вот гэта поняла, што гэта ад кваску"(Міёрскі р-н)*[2]. Шырока распаўсюджаным уяўленнем адносна ведзьм з'яўляецца матыў іх перакідвання ў розных істот з мэтай карысці, напрыклад адабраць малако ў каровы суседа ці суседкі. *"Асобенна ў Купальную ноч чаравалі [...] Ну і тады ўжо ў гэтых кароў ня станець малака, а ў яе ўжо будзець. А была тут жэньшчына, к ёй езьдзілі[...]Прывезьлі яе ўжо сюды, на дом, гэту жэншчыну. А карова ў хляве ўжо ляжала... І тут паказалася жаба-рабуха. Ну і гаворыць тая жэньшчына: "Абязацельнанадазагнаць кол у гэту жабу. Загналі кол у гэту жабу і малакозьяепацякло. А той бабе плоха стала – павісла на плату, стагнала – гэтакёй было плоха" (Ушацкі р-н)* [4, с. 10].

Узалежнасці ад каляндарга дня і ад пагрозы з боку чараўнікоў вяскоўцы прыдумлялі спосабы абароны ад іх. *"Не, дужа не было, такога рассказу, каб на Яна там нехта-нехта зачараваў [...] На парозе, на парозе вешалі калючага гэтага дзеда, каб не эта"(Міёрскі р-н)*[3].

Мужчыны-чараўнікі, паводле ўяўленняў беларусаў Падзвіння, заўсёды лічыліся мацнейшымі за жанчын-чараўніц. *"Чараўнікі[...] І бабы і мужукі бываюць. Але сіла ў мужчыны ёсь крапчэйшая." (Сененскі р-н)*[4, с. 37]; *"Мужыкі болей чаравалі, большая сіла ў іх была"(Чашніцкі р-н)* [4, с. 63].Вядомы даследчык народнай культуры Віцебшчыны М. Нікіфароўскі адзначыў у сваёй працы, што чарадзеямі могуць быць як мужчына, так і жанчына. Таксама ён піша, што жанчыны звычайна займаліся "бабскімі справамі" – чараваннем хатняй скаціны, псотай на палетках і да т.п. Мужчыны ж, хоць таксама могуць гэта рабіць, але амаль ніколі не апускаюцца да заняткаў [2, с. 283].У сваю чаргу, чараўнікі падзяляліся паводле сваёй кампетэнцыі (сілы) на "сапраўдных" (моцных) і "слабых". Прынцыповае адрозненне паміж імі заключалася ў тым, што "слабы" чараўнік – мог толькі шкодзіць людзям, а "моцныя" – маглі як шкодзіць, так і дапамагаць. Гэтае адрозненне ляжыць у аснове канфлікту або спаборніцтва паміж "слабымі" і "моцнымі" чараўнікамі. *"Адзін хваліцца, што я ўмею. І другі [...] "Раз ты ўмееш дзелаць, то ідзі, Вікенцій [...] прынясі мне рэдзьчыну"[...] Пайшоў дзед і прынёс рэдзьчыну. Тады гаворыць: "Возьмі яе разрэж. На табе кусок, і мне кусок. Калі вы зделаеця, каб яна была чорная, а тады белай назад." Гэты ўзяў і здзедаў яе чорнай, і гэты ўзяў – чорнай. Ну а тады, гаворыць: "Здзелай белую". Дык адзін здзелаў, а другі ня здзелаў. Дык гэты, каторы чорную здзелаў і белую, падышоў і гэтай рэдчынай як удзяліў яму ў морду!"( Талочынскі р-н)*[4, с. 52].

Чараўніцтва закранала ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, то бок яго фізічнае і псіхічнае здароўе, сямейныя і грамадскія адносіны, гаспадарчы і прафесійныя занняткі. Моцныя чараўнікі мелі свае функцыі ў вясковым соцыўме. Калі ў вёсцы быў такі моцны чараўнік, то яго абавязкова звалі на вяселле.Наратывы пра ведзьм у вясельным сцынарыі сустракаюцца вельмі рэдка. Такім чынам чараўнік падтрымліваў сваю асабістую негалосную ўладу у вёсцы. Ён выступаў сваеасаблівым абярэгам для маладых, то бок ён мог выявіць і абясшкодзіць чары, якія былі на маладых, або пакараць таго, хто збіраўся гэта зрабіць, або ўже зрабіў. Але калі чараўніку не аказвалася належнай увагі, то тады вяселле магло скончыцца сумна: "*Вот я гэта, як вышла замуж у дзярэўню Пранікі. Там расказвалі, была свадзьба, і аднаго мужчыну там не ўгасьцілі: не далі там выпіць. Ну і ён[...]падробіў маладой, што яна завалілася, як нежывая. Тады і дагадаліся. І ўгасцілі. І ўсе было харашо*" *(Ушацкі р-н)*[4, с. 32]. Аналагічную з'яву, калі чараўнік на вяселлі карае непрыяцеляў, яшчэ ў першай палове ХІХ ст. апісаў вядомы беларускі літаратар Ян Баршчэўскі [1, с. 19-20], што ўказвае на трывалы і кансерватыўны характар падобных уяўленняў у традыцыйным светапоглядзе беларусаў Падзвіння.У час канфлікта з чараўнікамі, ні палажэнне людзей у соцыўме, ні пол не гулялі ніякай ролі, то бок розніцы не было, што просты люд, што шляхта, што мужчына, што жанчына. *"А гэта шчыталася, як бы ўжо шляхціч жаніўся. [...]музыка была, танцаваць пашлі [...] ён гэтага во так локцем гэтага Івана таўхануў [...] "ты не будзеш тут стаяць, батрак, каля мяне". А гэты тады: "Ах, як так, ах ты, шляхціч, ды пархаты, будзеш ты мяне падштурхоўваць". Ён плюнуў і з хаты вон. Уся свадьба, што прыехалі і што былі, з-за столу вон [...] усе здзеліся і садзяцца тут усе [...] усе пазналі, што гэта Іванава работа [...]Разьдзеліся ды пасадзіліся [...] дагадаліся, што нада іцьці ка Йвану [...] Ён прышоў і толька плюнуў, і яны ўсе паўставалі, панадзяваліся" (Ушацкі р-н) [3, с. 226].*

Звесткі аб лекарскіх здольнасцяў чараўнікоў часцей сустракаюцца калі гаворка ідзе пра сурокі, наведзенне псоты, хваробы, напрыклад рожы. *"Вот рожа вот, ну вот, такое. [...]А тут была такая*

[2]ФА ПДУ: зап. Лобачам У. А., Сумко Е. В., ад Феафаніі Васілеўны Аляксандроўскай, 1928 г. н.ў вёсцы Язна Міёрскага раёна (нарадзілася ў в. Забор'е таго ж раёна).

[3]ФА ПДУ: зап. Лобачам У. А., Сумко Е. В., ад Феафаніі Васілеўны Аляксандроўскай, 1928 г. н.ў вёсцы Язна Міёрскага раёна (нарадзілася ў в. Забор'е таго ж раёна).

*бабка ў нас жыла. Пайду, яна прыйдзець. Нічога ў яе нет, нічога ніякага. Малітва какую-то там па..яна цехонечка, я не чую, што яна там моліць. Ну ўсё, гаворыць, твая свінка падымецца [...] I свінка выздаравліваець" (Верхнядзвінскі р-н)*[4].

Таксама сустракаюцца звесткі пра працэс навучэння таемным ведам. "*Калі хочаш, навучу цябе чараваць ... Ну давай, пайдзём, навучы мяне чараваць. Павёў гэтага чалавека ў лес і будзет вучыць чараваць..." (Докшыцкі р-н)* [4, с. 49].

Чараўніцтва маець тры формы рэалізацыі: першая - вербальныя, другая - атрыбутныя, трэцяя - акцыянальныя. Чараўніцтва закранала дзве важнейшыя галіны сельскай гаспадаркі – земляробства і жывёлагадоўлю.Дэманстрацыя сваіх здольнасцяў і адвядзенне асаблівага месца на вяселле і інш, паказвае вяршэнства чараўніка ў вёсцы. Іх паважалі, іх баяліся, таму насельніцтва імкнулася не сварыцца з імі. Некаторыя чараўнікі, якіх звалі на сямейныя святы, прымалі запрашэнні як належнае, але вяскоўцы ў некаторых выпадках рабілі гэта не з сымпатыі, а з-за страху, бо ён не сароміўся пагражаць гаспадарам, а таксама чараваць па любой справе. З асобай сымпатыяй ставіліся да тых чараўнікоў, якія дапамагалі людзям: лячылі, давалі замоўленую ваду, знімалі сурокі, адводзілі іншыя чары.У большасці выпадкаў чараўнікі шкодзілі сваім суседзям і прычынамі, як правіла, былі побытавыя канфлікты і няпростыя асабістыя ўзаемаадносіны, у адказ на гэта вяскоўцы выкарыстоўвалі традыцыйныя сродкі абярэгі ад іх дзеянняў.

ЛІТАРАТУРА

1. Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2005. – 214 с.
2. Богданович, А. Е. Пережитки Древнего Миросозерцания / А. Е. Богданович. – Гродна: Губернская Типографи 1895. – 186 с.
3. Полацкі этнаграфічны зборнік/ склад. У. А. Лобач, У. С.Філіпенка. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. - Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.
4. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. – Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння: у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.

[4]ФА ПДУ: зап. Бондар І. Г. у 2019 г. ад Авсюк Вольгі Іванаўны, 1938 г.н. у в. Верхняе Фаміно Верхнядзвінскага раёна.